# § 43–44. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XVII — XVIII ст.

ГАННА КАЦЯРЫНА РАДЗІВІЛ
КАНАЛ АНТОНІЙ ТЫЗЕНГАЎЗ
КРЫЧАЎСКАЕ ПАЎСТАННЕ
СКАРБОВАЯ КАМІСІЯ ВКЛ
МАНУФАКТУРА КАПІТАЛІЗМ
МІХАЛ КАЗІМІР АГІНСКІ
ЭКАНАМІЧНАЯ РЭФОРМА
ВАСІЛЬ ВАШЧЫЛА СТАРОСТВА

**Наступствы ваенных ліхалеццяў**

Якія войны прайшлі па тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVII — пачатку XVIII ст.?

**1. Эканамічны заняпад і дэмаграфічны спад.** Шматлікія войны, што прайшлі па тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVII — пачатку XVIII ст., прынеслі незлічоныя бедствы. Цэлыя паветы былі цалкам разбураны, спалены, разрабаваны (Гродзенскі, Браслаўскі, Ваўкавыскі, Аршанскі, Брэсцкі і інш.). Значнае скарачэнне колькасці насельніцтва, знішчэнне цяглай і прадукцыйнай жывёлы, з'яўленне вялікіх плошчаў неапрацаванай ворнай зямлі *(пустак)* прывялі да памяншэння аб'ёмаў сельскагаспадарчай вытворчасці.

Падчас ваенных ліхалеццяў была разбурана большасць гарадоў, асабліва на ўсходзе Беларусі. Паменшала рамесніцкіх спецыяльнасцей, мяшчане былі даведзены да галечы.

Разруху ў гарадах і сельскіх населеных пунктах суправаджалі голад і эпідэміі чумы (1653, 1658, 1664 гг.), якія значна скарачалі колькасць насельніцтва.

**Напрамкі аднаўлення сельскай гаспадаркі**

**2. Шляхі пераадолення крызісу.** Аднаўленне сельскай гаспадаркі ў другой палове XVII ст. адбывалася павольна. Шляхціцы (паны) імкнуліся захаваць фаль-

варкава-паншчынную сістэму ў тых месцах, дзе заставалася больш насельніцтва, — у прыватнасці, у заходняй і цэнтральнай частках Беларусі. На ўсходзе, дзе разбурэнні былі больш маштабныя і рабочых рук катастрафічна не хапала, феадалы пераводзілі сялян на аброк. Гэта давала залежнаму насельніцтву большую самастойнасць і прыцягвала на пусткі новых пасяленцаў. Паны падчас ваенных разбурэнняў давалі сялянам дадатковую («прыёмную») да асноўнага надзела зямлю, павіннасці з якой выконваліся ў меншым памеры. У мірныя гады доля «прыёмнай» зямлі памяншалася. Пасля Паўночнай вайны пасяўныя плошчы пачалі пашыраць за кошт высечкі лесу. Новая ралля давала лепшы ўраджай, чым старыя надзелы. Сяляне пры гэтым атрымлівалі лес на ўзвядзенне жылых і гаспадарчых пабудоў, а таксама на дровы. Па меры аднаўлення і ўмацавання сялянскай гаспадаркі раслі феадальныя павіннасці. Да сярэдзіны XVIII ст. паншчына дасягала 12 і больш дзён на тыдзень з валокі. Дзякуючы руплівай працы сялян сельская гаспадарка была збольшага адноўлена: значна павялічылася плошча ворных зямель, павысілася культура земляробства, вырасла пагалоўе жывёлы, аднак гэта не зрабілася асновай для сталага эканамічнага росту.

Растлумачце, чаму колькасць дзён паншчыны перавышала колькасць дзён у тыдні.

**Цяжкасці аднаўлення гарадскога жыцця**

З аднаўленнем вёскі паступова адраджаліся беларускія гарады. Але вярнуць былую веліч некаторым з іх так і не атрымалася. Найхутчэй падымаліся з руін Магілёў, Нясвіж, Навагрудак. У прыватнасці, Нясвіж цалкам адбудаваў яго ўладар Міхал Казімір Радзівіл (Рыбанька).

**Сацыяльныя канфлікты**

**3. Сацыяльныя супярэчнасці.** У XVII ст. у ВКЛ абвастрылася барацьба паміж рознымі саслоўнымі групамі. Найбуйнейшыя выступленні гараджан былі ў Гродне (1670 г., 1700 г.), Магілёве (1633 г.).

У 60–80-я гг. XVII ст. узброеныя хваляванні сялян мелі месца ў Пінскай і Тураўскай валасцях, Брэсцкім і Гродзенскім паветах. Найбуйнейшымі выступленнямі сялян у XVIII ст. зрабіліся паўстанні ў *Крычаўскім*

**САЦЫЯЛЬНЫЯ СУПЯРЭЧНАСЦІ**

| | ГОРАД (багатая вярхушка ↕ гарадскія нізы) | ВЁСКА (феадалы ↕ залежныя сяляне) |
|---|---|---|
| ***Прычыны*** | пашырэнне маёмаснай няроўнасці, захоп заможнымі вярхамі гарадской улады, выкарыстанне яе ў сваіх мэтах, павелічэнне колькасці юрыдык | павелічэнне феадальных павіннасцей, узмацненне эксплуатацыі сялян, здача маёнткаў у арэнду |
| ***Формы барацьбы*** | скаргі, заявы ў суды, адмова ад падпарадкавання адміністрацыі або арандатару, паўстанні | скаргі, уцёкі, адмова ад выканання павіннасцей, самавольная высечка лесу і паляванне ў ім, забойствы шляхціцаў або арандатараў, паўстанні |

Як вы лічыце, чаму практыка здачы маёнткаў у арэнду зрабілася прычынай сялянскіх паўстанняў?

*старостве (1740–1744 г.)* і *Камянецкай воласці (1754–1756 гг.)*.

**Крычаўскае паўстанне (1740–1744 гг.)**

Паўстанне жыхароў Крычаўскага староства (Магілёўшчына) узначаліў войт в. Селішча *Васіль Вашчыла*. Ён рашуча выступіў супраць злоўжыванняў мясцовай адміністрацыі і арандатараў маёнткаў. На чале сялянскага паўстання Вашчыла выгнаў найбольш жорсткіх арандатараў, прымусіў адміністрацыю падпісаць 20 новых дамоў. Калі сялянскае войска вырасла да 2000 чалавек, трымальнік староства Геранім Фларыян Радзівіл загадаў падавіць выступленне. 26 студзеня 1744 г. каля в. Цэркавішча паўстанцы атрымалі паражэнне. Многія з іх загінулі, некаторых захапілі ў палон, 16 кіраўнікоў паўстання прысудзілі да смяротнага пакарання. Унікальнасць Крычаўскага паўстання заключалася ў тым, што на

Даведайцеся, як склаўся лёс Васіля Вашчылы пасля задушэння Крычаўскага паўстання.

працягу чатырох гадоў на даволі значнай тэрыторыі ўлада знаходзілася ў руках простых людзей. Пры гэтым сяляне працягвалі выплачваць трымальніку староства падаткі, а таксама суму за арэнду зямлі.

Паўстанне на Каменшчыне (1754–1756 гг.)

Паўстанне ў Камянецкай воласці Мазырскага павета адбылося ва ўладаннях каталіцкай царквы. У 1754 г. выступленне мясцовых сялян перарасло ва ўзброенае паўстанне пад уплывам *гайдамакаў* (удзельнікаў вызваленчага руху ва Украіне). Для падаўлення канфлікту вялікі гетман Міхал Казімір Радзівіл накіраваў туды дзве харугвы. Але яны не дасягнулі пастаўленай мэты — паўстанне разраслося і ахапіла ўсю Камянецкую воласць. У студзені 1756 г. шляхецкае войска атрымала паражэнне каля мястэчка Славечна. Сабраўшы падмацаванне, шляхта здолела задушыць сялянскае выступленне: 60 паўстанцаў загінула, 60 было паранена і ўзята ў палон.

Назавіце агульныя рысы сялянскіх паўстанняў у Крычаўскім старостве і Камянецкай воласці.

Наступствы паўстанняў

Сялянскі пратэст вымусіў уладу і феадалаў аслабіць прыгнёт. У 1768 г. сойм Рэчы Паспалітай увёў смяротнае пакаранне за забойства селяніна. Паступова пад уплывам ідэй Асветніцтва сярод землеўладальнікаў пачала пашырацца думка, што іх дабрабыт залежыць ад моцнай сялянскай гаспадаркі.

Пачатак фарміравання капіталістычных адносін на тэрыторыі Беларусі

**4. Зараджэнне капіталістычных адносін. З'яўленне мануфактур. Магнацкае прадпрымальніцтва.** Рост таварнасці сельскай гаспадаркі спрыяў паглыбленню маёмаснай дыферэнцыяцыі ў вёсцы. З аднаго боку, павялічвалася колькасць заможных сялян, з другога — збяднелых. Гэта, у сваю чаргу, стварала рынак рабочай сілы. Наёмныя рабочыя атрымлівалі натуральную або грашовую аплату сваёй працы. Ва ўмовах прыгоннай залежнасці ў асноўным пераважаў прымусовы наём. У *1720–1730-я гг.* на тэрыторыі Беларусі ўзнікла *мануфактурная вытворчасць*. Усе гэтыя з'явы сведчылі пра пачатак фарміравання капіталістычных адносін.

Калі мануфактуры ўзніклі ў Еўропе? Чаму на тэрыторыі Беларусі мануфактурная вытворчасць з'явілася пазней?

Перадумовы ўзнікнення мануфактур

На тэрыторыі Беларусі мануфактуры пачалі з'яўляцца ва ўладаннях найбагацейшай часткі грамадства — магнатаў. Менавіта яны мелі пэўны капітал,

## ЭВАЛЮЦЫЯ ТАВАРНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

Рамесніцкая майстэрня → Мануфактура → Фабрыка

свабодную зямлю для ўзвядзення вытворчых будынкаў, танную сыравіну, бясплатную рабочую сілу ў асобе прыгонных сялян. Развіццю мануфактурнай вытворчасці спрыяў перыяд спакою пасля войнаў, падчас якога шляхта імкнулася да прыгожага і камфортнага жыцця. Выпускаючы ўнікальныя вырабы, можна было не толькі здзіўляць славутых гасцей, але і паменшыць уласныя выдаткі на той ці іншы прадукт, які раней даводзілася завозіць з краін Заходняй Еўропы. Мануфактуры былі рэальнай магчымасцю аднавіць матэрыяльны дабрабыт роду, які

### ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



**Ганна Кацярына Радзівіл**
*(«Чорная дама»)*
*(1676–1746 гг.)*



**Міхал Казімір Радзівіл**
*(«Рыбанька»)*
*(1702–1762 гг.)*



**Геранім Фларыян Радзівіл**
*(«Жорсткі»)*
*(1715–1760 гг.)*

*1. Чаму славутыя сваякі з роду Радзівілаў атрымалі такія мянушкі?*
*2. Які след кожны з іх пакінуў у эканамічным развіцці Беларусі?*

часцяком пасля войнаў знаходзіўся не ў найлепшым стане. З гэтай прычыны *Ганна Кацярына Радзівіл* і зрабілася заснавальніцай першых мануфактур на тэрыторыі Беларусі.

**Развіццё мануфактурнай вытворчасці**

У першай палове XVIII ст. Ганна Радзівіл, а пасля і яе сыны Геранім Фларыян і Міхал Казімір заснавалі ў сваіх уладаннях больш за 20 мануфактур. Для арганізацыі іх дзейнасці ў Еўропе закуплялася абсталяванне і наймаліся найлепшыя спецыялісты. Асартымент прадукцыі быў вельмі шырокі: шкло і вырабы з яго, асвятляльныя прыборы, сталовы і кухонны посуд, габелены, мэбля, сукно, гадзіннікі, парасоны, кафля і інш. Так, напрыклад, на Налібоцкай мануфактуры (Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці) выпускалі больш за 100 найменняў высокамастацкіх вырабаў. Урэцкая мануфактура (Любанскі раён Мінскай вобласці) зрабілася першым прадпрыемствам у Рэчы Паспалітай па вырабе люстэркаў. А найбольш вядомая была «персіярня» ў Слуцку — тут выраблялі славутыя слуцкія паясы, дываны, «персідскую» і «кітайскую» тканіны.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Слуцкія паясы — адна з рэліквій беларусаў. Высветліце, чаму гэта так.



1. *Дзе і калі ўзнікла першая мануфактура па вырабе паясоў? Хто быў яе ўладальнікам? Чаму ў дачыненні да яе выкарыстоўвалі назву «персіярня»?*
2. *Што сабой уяўляў класічны слуцкі пояс? Кім і як ён выкарыстоўваўся?*
3. *Прачытайце верш М. Багдановіча «Слуцкія ткачыхі». Якія гістарычныя недакладнасці вы ў ім заўважылі?*
4. *Дзе і з якой мэтай сёння арганізаваны выраб слуцкіх паясоў у Беларусі?*
5. *Знайдзіце тры цікавыя факты пра слуцкія паясы.*

Магнацкае прадпрымальніцтва

Сярод іншых прадпрыемстваў найбуйнейшымі лічыліся металургічныя мануфактуры магнатаў Храптовічаў у Вішневе (Ашмянскі павет), фаянсавая мануфактура князёў Агінскіх у Целяханах (Пінскі павет), суконныя і палатняныя мануфактуры магнатаў Сапегаў у Ружанах і інш. У сваіх уладаннях прадпрымальнікі ўводзілі прагрэсіўныя метады гаспадарання. Так, напрыклад, у Вішневе выкарыстоўвалі найноўшае абсталяванне і была пабудаваная першая ў Беларусі доменная печ. Тут выплаўлялі жалеза, чыгун і выраблялі розны сельскагаспадарчы інвентар, які карыстаўся вялікім попытам.

Асаблівасці мануфактурнай вытворчасці

У другой палове XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі існавала больш за 50 мануфактур, на якіх працавала каля 2,5 тыс. чалавек. Мануфактурная форма вытворчасці тут мела свае асаблівасці. Звычайна новыя прадпрыемствы існавалі толькі на працягу жыцця іх заснавальнікаў. У вялікай ступені выкарыстоўвалася праца прыгонных сялян. Толькі частка прадукцыі, выробленай на вотчынных мануфактурах, ішла на рынак, першачарговая іх мэта — задавальненне патрэб уладальніка. Кошт тавараў быў вельмі высокі, што выклікала складанасці ў іх продажы, таму шмат якія вотчынныя прадпрыемствы працавалі з малым даходам або нават цярпелі страты і не вытрымлівалі канкурэнцыі з замежнымі вытворцамі.

Эканамічныя пераўтварэнні

Выкажыце здагадку, чаму ў другой палове XVIII ст. паўстала неабходнасць у правядзенні эканамічных рэформаў.

**5. Спробы эканамічнага рэфармавання ў другой палове XVIII ст.** У другой палове XVIII ст. была здзейснена спроба мадэрнізацыі Рэчы Паспалітай. Кароль *Станіслаў Аўгуст Панятоўскі* (1764–1795 гг.) і яго прыхільнікі правялі ў краіне эканамічныя рэформы. Шэраг пастаноў у гэтым кірунку быў прыняты на сойме *1764 г.* Сярод іх — адмова ад «ліберум вета» пры разглядзе эканамічных пытанняў: цяпер рашэнні прымалі большасцю галасоў шляхецкіх паслоў. Таксама былі створаны асобныя

скарбовыя камісіі для ВКЛ і Польшчы, якія кантралявалі фінансы краіны. *Скарбовая камісія ВКЛ* дзейнічала ў Гродне. Яна распараджалася мытнямі, поштай, гандлёвымі шляхамі, рачнымі перавозкамі, зборам падаткаў. Замест шматлікіх прыватных пошлін была ўведзена адзіная мытная пошліна («генеральная»). Скасавалі кватэрную павіннасць мяшчан, якой карысталіся шляхецкія паслы, дэпутаты і службовыя асобы падчас правядзення вальнага сойма і пасяджэнняў Галоўнага Трыбунала ВКЛ. Манастырам забаранялася мець корчмы, прадаваць алкагольныя напоі, г. зн. спаборнічаць з мяшчанскім гандлем. Апроч таго, з *1766 г.* у Рэчы Паспалітай былі ўведзены адзіныя меры вагі, аб'ёму, даўжыні, што спрыяла развіццю гандлю. У гаспадарчую дзейнасць пачала актыўна ўцягвацца шляхта, бо рашэннем сойма 1775 г. ёй дазваляліся мяшчанскія заняткі. Усе гэтыя меры спрыялі нармалізацыі гарадскога жыцця, сведчаннем чаго зрабіўся рост колькасці гараджан. Напрыканцы XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі налічвалася 389 гарадскіх паселішчаў, у якіх жыло каля 250 тыс. чалавек (11 % ад усяго насельніцтва ВКЛ).

**Будаўніцтва першых каналаў**

| | | |
|---|---|---|
| Агінскі канал (54 км) | 1765–1783 гг. | Злучыў р. Ясельду (прыток Прыпяці) і р. Шчару (прыток Нёмана) |
| Дняпроўска-Бугскі канал («Каралеўскі») (110 км) | 1775–1784 гг. | Злучыў р. Мухавец (басейн Заходняга Буга) з р. Пінай (басейн Прыпяці) |

Якую ролю каналы адыгралі ў развіцці гандлю? Даведайцеся, чаму канал атрымаў назву «Каралеўскі».

**Развіццё шляхоў зносін**

Развіццю гандлю спрыяла пашырэнне шляхоў зносін. На сродкі магната *Міхала Казіміра Агінскага* з ініцыятывы адміністратара яго зямель *Мацея Бутрымовіча* пачалі капаць каналы, чысцілі ложы

рэк, будавалі масты і прычалы. У выніку грандыёзных праектаў М. Бутрымовіча па асушэнні палескіх балот былі пракладзены новыя сухапутныя тракты, у прыватнасці, пінска-слонімскі і пінска-валынскі.

Эканамічная рэформа А. Тызенгаўза

## ЭКАНАМІЧНАЯ РЭФОРМА 1765 Г.




У другой палове XVIII ст. змянілася стаўленне дзяржавы да эканомій. Згодна з пастановай сойма 1764 г. была забаронена іх здача ў арэнду, і яны былі перададзены пад дзяржаўнае кіраўніцтва. Надворны падскарбій ВКЛ *Антоній Тызенгаўз* у *1765 г.* пачаў эканамічную рэформу ў каралеўскіх эканоміях. Паводле задумы рэформа была комплексная і адначасова ахоплівала сельскую гаспадарку, прамысловасць і гандаль. Прадугледжвалася аднаўленне фальваркаў і паляпшэнне тэхналогіі апрацоўкі зямлі — напрыклад, уводзіўся чатырохпольны севазварот за кошт пасеваў шматгадовых траў. Гэтыя мерапрыемствы павінны былі павялічыць дзяржаўныя даходы, якія планавалася накіраваць на арганізацыю новых мануфактур. Сяляне атрымалі права перадаваць свой надзел у спадчыну, пашыраць яго за кошт «прыёмнай» зямлі. Гэта мусіла павысіць іх зацікаўленасць у рабоце. У выніку рэформы ў эканоміях павялічылася колькасць сялян, якія адпрацоўвалі паншчыну. І хоць на пачатковым этапе даходы каралеўскага двара ўзраслі, рэформа скончылася правалам. Большасць сялян не прыняла яе, бо з вяртаннем паншчыны павялічваліся іх павіннасці.

У 1760–1780 гг. у Гродзенскай і Брэсцкай эканоміях было адкрыта больш за 20 каралеўскіх мануфактур: шаўковая, панчошная, карэтная і інш. Аднак вялікія крэдыты на іх будаўніцтва, неэканомнае выкарыстанне сыравіны, адсутнасць зацікаўленасці майстроў і рабочых, неэфектыўнасць прыгоннай працы прывялі да заняпаду прадпрыемстваў і, адпаведна, да няўдачы гаспадарчай палітыкі А. Тызенгаўза.




*Эканоміка Беларусі ў XVIII ст.*

Карыстаючыся інфармацыяй картасхемы, раскажыце пра развіццё сельскай гаспадаркі, гандлю, мануфактурнай вытворчасці на тэрыторыі Беларусі ў XVIII ст.

*У другой палове XVII — XVIII ст. удалося не толькі аднавіць гаспадарку пасля ваенных ліхалеццяў, але і правесці шэраг эканамічных рэформаў. Паступова ў нетрах феадальнага ладу пачалі зараджацца капіталістычныя элементы. Аднак эканамічныя пераўтварэнні прывялі да пагаршэння становішча феадальна-залежнага насельніцтва, не знайшлі яны падтрымкі і ў часткі магнатаў і шляхты, якія пазбягалі новаўвядзенняў. Акрамя таго, суседнія дзяржавы, занепакоеныя магчымым узмацненнем Рэчы Паспалітай, імкнуліся спыніць мадэрнізацыю краіны.*

**калі ў свеце...**

XVI–XVIII стст. — станаўленне і развіццё капіталістычных адносін у Заходняй Еўропе

**на тэрыторыі Беларусі...**

Першая палова XVIII ст. — пачатак фарміравання капіталістычных адносін

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Дакажыце, што ў другой палове XVII — пачатку XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі назіраўся эканамічны заняпад і дэмаграфічны спад. З чым гэта было звязана?
2. Выкажыце здагадку, чаму мануфактуры не ператварыліся ў пануючую форму арганізацыі вытворчасці на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVIII ст. Падрыхтуйце паведамленне аб дзейнасці адной з іх.
3. Ахарактарызуйце эканамічную рэформу А. Тызенгаўза. Вызначце моцныя і слабыя бакі яго пераўтварэнняў. Даведайцеся, за якія заслугі адна з плошчаў г. Гродна названа яго імем.
4. У XVI–XVIII стст. у Заходняй Еўропе развіваліся капіталістычныя адносіны. Ці можна казаць пра развіццё капіталізму ў гэты час на тэрыторыі Беларусі? Сваю думку абгрунтуйце.